ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
15 верасня 2023 г. № 132

# Аб зацвярджэнні праекта зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Фрагменты комплексу былой сядзібы: сядзібны дом, вадаёмы, фрагменты парку, рэшткі гаспадарчых пабудоў і спіртзавода» ў в. Туча Клецкага раёна Мінскай вобласці

На падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры і абзаца пятага падпункта 5.27 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Фрагменты комплексу былой сядзібы: сядзібны дом, вадаёмы, фрагменты парку, рэшткі гаспадарчых пабудоў і спіртзавода» ў в. Туча Клецкага раёна Мінскай вобласці (дадаецца).

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Міністр** **А.М.Маркевіч**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
15.09.2023 № 132

## Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Фрагменты комплексу былой сядзібы: сядзібны дом, вадаёмы, фрагменты парку, рэшткі гаспадарчых пабудоў і спіртзавода» ў в. Туча Клецкага раёна Мінскай вобласці

### ГЛАВА 1
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Фрагменты комплексу былой сядзібы: сядзібны дом, вадаёмы, фрагменты парку, рэшткі гаспадарчых пабудоў і спіртзавода» ў в. Туча Клецкага раёна Мінскай вобласці (далей – праект зон аховы) распрацаваны на падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

2. «Фрагменты комплексу былой сядзібы: сядзібны дом, вадаёмы, фрагменты парку, рэшткі гаспадарчых пабудоў і спіртзавода» ў в. Туча Клецкага раёна Мінскай вобласці з’яўляецца нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю катэгорыі «3» (далей – гісторыка-культурная каштоўнасць), уключанай пад шыфрам 613Г000210 у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

3. Праект зон аховы распрацаваны індывідуальным прадпрымальнікам Вашкевічам Аляксандрам Сяргеевічам па заказе агракамбіната «Туча» філіяла адкрытага акцыянернага таварыства «МІНСК КРЫШТАЛЬ» – кіруючай кампаніі холдынгу «МІНСК КРЫШТАЛЬ ГРУП».

4. Праект зон аховы распрацаваны з мэтай забеспячэння захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе навакольнага асяроддзя, вызначае межы тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці, зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці і іх межы, рэжымы ўтрымання і выкарыстання зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці.

5. Праект зон аховы распрацаваны на падставе архіўна-бібліяграфічных і натурных даследаванняў, аналізу горадабудаўнічай сітуацыі і ландшафту.

6. Праектам зон аховы ўстаноўлена тэрыторыя гісторыка-культурнай каштоўнасці, ахоўная зона гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – ахоўная зона), зона рэгулявання забудовы гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – зона рэгулявання забудовы) і зона аховы ландшафту гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – зона аховы ландшафту), іх межы і рэжымы іх утрымання і выкарыстання.

Схема зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці дадаецца.

## ГЛАВА 2
## ТЭРЫТОРЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ. АХОЎНАЯ ЗОНА

7. Тэрыторыя гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлена ў мэтах забеспячэння магчымасці навуковага даследавання і захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Ахоўная зона супадае з тэрыторыяй гісторыка-культурнай каштоўнасці.

8. Мяжой тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці і ахоўнай зоны з’яўляюцца:

на поўначы – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 1 на паўночны ўсход паралельна гаспадарчай пабудове (свірну) з водступам ад яе 10,0 м да кропкі 2; далей на паўднёвы захад да кропкі 3; далей на паўднёвы ўсход да кропкі 4;

на ўсходзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 4 на паўднёвы захад да кропкі 5;

на поўдні – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 5 на паўночны захад да кропкі 6 на адлегласці 5,0 м ад гаспадарчай пабудовы (карчмы); далей на паўночны ўсход да кропкі 7 з водступам ад гаспадарчай пабудовы на 5,0 м; далей на паўночны захад уздоўж праезду да кропкі 8;

на захадзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 8 на паўночны ўсход да кропкі 1.

9. На тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці і ў ахоўнай зоне забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў, акрамя навукова абгрунтаванага аднаўлення страчаных гістарычных аб’ектаў і гістарычнай планіроўкі, выкананага на падставе навукова-даследчых работ;

знішчэнне, прычыненне шкоды, пагаршэнне тэхнічнага стану гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама навукова неабгрунтаванае змяненне (у тым ліку змяненне параметраў будынкаў, страта канструктыўных і архітэктурных асаблівасцей і элементаў) і пагаршэнне ўмоў яе ўспрымання;

рэканструкцыя і мадэрнізацыя дысгарманічных будынкаў і збудаванняў з павелічэннем іх аб’ёмна-прасторавага рашэння і без прыняцця адпаведных мер па іх нейтралізацыі ў навакольным асяроддзі;

будаўніцтва дадатковых транзітных транспартных камунікацый, акрамя рэканструкцыі мясцовых праездаў і пад’ездаў да гісторыка-культурнай каштоўнасці;

высечка дрэў (акрамя аб’ектаў расліннага свету, якія знаходзяцца ў неналежным (аварыйным) стане на падставе адпаведнага заключэння, а таксама акрамя санітарных рубак) без іх наступнага аднаўлення;

правядзенне работ па добраўпарадкаванні і азеляненні, якое пагаршае ўспрыманне аб’ёмна-прасторавых уласцівасцей і элементаў гісторыка-культурнай каштоўнасці;

усталяванне сродкаў вонкавай рэкламы, якія ствараюць перашкоды для візуальнага ўспрымання аб’ёмна-прасторавых уласцівасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці;

будаўніцтва наземных інжынерных камунікацый і збудаванняў, акрамя элементаў вонкавага асвятлення;

уладкаванне вонкавага асвятлення, якое пагаршае ўмовы ўспрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці;

размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў, транспартна-складскіх і іншых будынкаў, якія павялічваюць грузавыя патокі, забруджваюць паветраны басейн, з’яўляюцца выбухова- і пажаранебяспечнымі;

ажыццяўленне гаспадарчай дзейнасці, якая шкодзіць гісторыка-культурным каштоўнасцям або скажае ўспрыманне гістарычнага характару тэрыторыі і ландшафту;

правядзенне земляных работ без правядзення археалагічных даследаванняў па выяўленні археалагічных аб’ектаў і артэфактаў у адпаведнасці з артыкуламі 129 і 130 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

## ГЛАВА 3
## ЗОНА РЭГУЛЯВАННЯ ЗАБУДОВЫ

10. Зона рэгулявання забудовы вызначана зыходзячы з умоў бачнасці гісторыка-культурных каштоўнасцей з улікам тэрыторыі з гістарычнай планіровачнай і аб’ёмна-прасторавай структурай, сучаснай горадабудаўнічай сітуацыі, а таксама з мэтай неабходнасці рэгламентавання маштабу новага будаўніцтва і рэканструкцыі забудовы на тэрыторыях, якія прылягаюць да гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Зона рэгулявання забудовы складаецца з двух участкаў.

11. Мяжой першага ўчастка зоны рэгулявання забудовы з’яўляюцца:

на поўдні і захадзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 9 на паўночны захад да кропкі 10; далей на поўдзень па мяжы зямельных участкаў прыватнай забудовы да кропкі 11; далей на захад па мяжы зямельнага ўчастка прыватнай забудовы да кропкі 12; далей уздоўж праезнай часткі вул. Набярэжнай да кропкі 13;

на поўначы – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 13 на ўсход, часткова па мяжы прыватнай забудовы і зялёнага масіву праз кропку 14 да кропкі 15; далей на паўднёвы ўсход па мяжы зямельных участкаў прыватнай забудовы да кропкі 16; далей уздоўж праезнай часткі вул. Леніна на паўночны ўсход да кропкі 17; далей на паўднёвы ўсход уздоўж праезнай часткі вул. Гвардзейскай да кропкі 18;

на ўсходзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 18 на паўднёвы захад, часткова ўздоўж праезнай часткі вул. Садовай да кропкі 19; далей на паўднёвы ўсход уздоўж мяжы прыватнай забудовы да кропкі 20; далей уздоўж праезнай часткі вул. Касманаўтаў праз вул. Лясную да кропкі 21; далей на паўднёвы захад да кропкі 22; далей на паўночны захад да кропкі 23; далей ад кропкі 23 да кропкі 9 уздоўж мяжы ахоўнай зоны, якая супадае з мяжой тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці.

12. Мяжой другога ўчастка зоны рэгулявання забудовы з’яўляюцца:

на поўдні – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 34 на паўднёвы захад да кропкі 35;

на захадзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 35 на паўночны захад уздоўж праезнай часткі вул. Інтэрнацыянальнай да кропкі 36; далей на паўночны ўсход уздоўж вул. Сіняўскай да кропкі 37; далей на паўночны захад уздоўж праезнай часткі вул. Зарэчнай да кропкі 38;

на поўначы – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 38 да кропкі 39;

на ўсходзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 39 на паўднёвы ўсход да кропкі 34.

13. На тэрыторыі зоны рэгулявання забудовы забараняецца:

узвядзенне новых будынкаў і збудаванняў вышэй за 7,0 м ад узроўню глебы да ўзроўню вільчака даху па левабярэжнай лініі р. Тучанка і ўздоўж вул. Зарэчнай ад кропкі 33 да кропкі 34;

узвядзенне новых будынкаў і збудаванняў вышэй за 10,0 м ад узроўню глебы да ўзроўню вільчака даху (акрамя навукова абгрунтаванага аднаўлення страчаных гістарычных аб’ектаў) без уліку характару гістарычнай забудовы, працягласці і маштабнасці будынкаў, выкарыстання будаўнічых матэрыялаў, колеравага рашэння фасадаў, выкананага на падставе навукова-даследчых работ;

размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў, транспартна-складскіх і іншых збудаванняў, якія павялічваюць грузавыя патокі, забруджваюць паветраны і водны басейны, выбухова- і пажаранебяспечныя;

усталяванне з боку вуліц агароджы светапразрыстасцю меней за 50 %, вышынёй больш за 1,5 м і без выкарыстання традыцыйных формаў, матэрыялаў і колераў.

## ГЛАВА 4
## ЗОНА АХОВЫ ЛАНДШАФТУ

14. Зона аховы ландшафту вызначана з мэтай захавання гістарычнага асяроддзя і прыродных панарам наваколля, візуальна звязаных з гісторыка-культурнай каштоўнасцю, і стварэння неабходных умоў для ўспрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Зона аховы ландшафту складаецца з двух участкаў.

15. Першы ўчастак зоны аховы ландшафту ўключае тэрыторыю пладовага сада, якая прымыкае да ахоўнай зоны.

Мяжой першага ўчастка зоны аховы ландшафту з'яўляюцца:

на ўсходзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 24 на паўночны ўсход уздоўж праезнай часткі вул. Садовай да кропкі 25; далей праз кропку 26 да кропкі 27;

на поўначы – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 27 на паўночны захад па мяжы зямельных участкаў прыватнай забудовы да кропкі 28;

на захадзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 28 на паўднёвы захад да кропкі 29; далей на паўночны захад да кропкі 30; далей на паўднёвы захад да кропкі 31;

на поўдні – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 31 на паўднёвы ўсход да кропкі 24 і супадае з мяжой ахоўнай зоны.

16. Другі ўчастак зоны аховы ландшафту ўключае тэрыторыі, якія непасрэдна прылягаюць да поймы р. Тучанка і створаных на ёй вадаёмаў, у тым ліку поймавая частка р. Тучанка, сажалкі, якія захаваліся, дамба з плацінай і зялёны масіў у паўночнай частцы в. Туча.

Мяжой другога ўчастка зоны аховы ландшафту з'яўляюцца:

на поўначы – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 14 на паўночны захад уздоўж праезнай часткі вул. Набярэжнай да кропкі 32; далей ад кропкі 32 на захад да кропкі 33;

на захадзе – умоўная лінія, якая супадае з мяжой другога ўчастка зоны рэгулявання забудовы і ідзе ад кропкі 33 на поўдзень да кропкі 39; далей да кропкі 34;

на ўсходзе – умоўная лінія, якая ідзе ад кропкі 34 на паўночны ўсход да кропкі 22; далей на паўночны захад да кропкі 23; далей па лініі, якая супадае з мяжой ахоўнай зоны праз кропкі 5, 6, 7 і 8 да кропкі 9; далей па лініі, якая супадае з мяжой першага ўчастка зоны рэгулявання забудовы праз кропкі 10, 11, 12 і 13 да кропкі 14.

17. На тэрыторыі зоны аховы ландшафту забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў, акрамя пракладкі неабходных падземных інжынерных камунікацый і часовых будынкаў і збудаванняў рэкрэацыйнага прызначэння з выкарыстаннем уласцівых навакольнаму асяроддзю прыродных матэрыялаў;

ажыццяўленне дзейнасці, якая прыводзіць да змены характару гістарычнага ландшафту, акрамя аднаўлення гістарычна існаваўшых элементаў рэльефа прыроднага і антрапагеннага паходжання, выяўленых на падставе навукова-даследчых работ;

высечка дрэў, акрамя аб'ектаў расліннага свету, якія знаходзяцца ў неналежным (аварыйным) стане на падставе адпаведнага заключэння, і санітарных рубак, а таксама акрамя работ па ачыстцы берагоў і дна вадаёмаў ад расліннасці, забалочанасці і аднаўлення закінутых сажалак, умацаванні схілаў і іншых аналагічных работ;

будаўніцтва дадатковых транзітных транспартных камунікацый, акрамя рэканструкцыі існуючых мясцовых праездаў і дарог, правядзення рамонтна-аднаўленчых работ на дамбе, плаціне і яе элементах;

ажыццяўленне гаспадарчай дзейнасці, якая шкодзіць гісторыка-культурным каштоўнасцям або скажае ўспрыманне гістарычнага характару тэрыторыі і ландшафту.

Дадатак
да праекта зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Фрагменты комплексу былой сядзібы: сядзібны дом, вадаёмы, фрагменты парку, рэшткі гаспадарчых пабудоў і спіртзавода» ў в. Туча Клецкага раёна Мінскай вобласці

# СХЕМА ЗОН АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ




### Эксплікацыя

| № на схеме | Назвы | Катэгорыя гісторыка-культурнай каштоўнасці |
|---|---|---|
| 1 | Фрагменты комплексу былой сядзібы: сядзібны дом, вадаёмы, фрагменты парку, рэшткі гаспадарчых пабудоў і спіртзавода | 3 |
| 1.1 | Сядзібны дом | |
| 1.2 | Рэшткі гаспадарчай пабудовы (свіран) | |
| 1.3 | Рэшткі гаспадарчай пабудовы (карчма) | |
| 1.4 | Рэшткі гаспадарчай пабудовы (у аварыйным стане) | |
| 1.5 | Рэшткі гаспадарчай пабудовы | |
| 1.6 | Рэшткі спіртзавода (у аварыйнам стане) | |
| 1.7 | Рэшткі гаспадарчай пабудовы (кузня) | |
| 1.8 | Рэшткі гаспадарчай пабудовы (дом для рабочых) | |
| 1.9 | Рэшткі гаспадарчай пабудовы (гумно) | |
| 1.10 | Рэшткі парадная ўязной брамы (зруйнаваная) | |
| 1.11 | Вадаёмы (сучасны стан) | |
| 1.12 | Фрагменты парку (былая тэрыторыя) | |
| 1.13 | Фрагменты саду | |
| 2 | Помнік савецкім воінам, загінуўшым ад ран | |
| 3 | Дысгарманічныя пабудовы сельскагаспадарчага прызначэння | |

### Умоўныя абазначэнні

| № п/п | Абазначэнне | Назвы |
|---|---|---|
| 1 | | Гісторыка-культурныя каштоўнасці |
| 2 | | Тэрыторыя гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўная зона |
| 3 | | Зона рэгулявання забудовы |
| 4 | | Зона аховы ландшафту |
| 5 | | Дысаніруючая забудова |
| 6 | | Рэшткі гаспадарчых пабудоў |
| 7 | | Шэрагавая жылая і грамадская забудова |

### Сістэма каардынат WGS84

| № на схеме | Паўночная шырата | Усходняя даўгата | 13 | 52.964332 | 26.539167 | 27 | 52.963435 | 26.547611 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 14 | 52.964551 | 26.541180 | 28 | 52.964097 | 26.545066 |
| 1 | 52.962839 | 26.543832 | 15 | 52.964480 | 26.541791 | 29 | 52.963280 | 26.544593 |
| 2 | 52.961892 | 26.547229 | 16 | 52.964130 | 26.543803 | 30 | 52.963325 | 26.544395 |
| 3 | 52.961691 | 26.547112 | 17 | 52.964877 | 26.544273 | 31 | 52.962778 | 26.544054 |
| 4 | 52.961414 | 26.548035 | 18 | 52.963346 | 26.550105 | 32 | 52.965838 | 26.540808 |
| 5 | 52.959214 | 26.546346 | 19 | 52.963207 | 26.549800 | 33 | 52.965619 | 26.534836 |
| 6 | 52.960009 | 26.543543 | 20 | 52.962558 | 26.550701 | 34 | 52.957067 | 26.545080 |
| 7 | 52.960681 | 26.544009 | 21 | 52.961840 | 26.549252 | 35 | 52.956486 | 26.543562 |
| 8 | 52.961023 | 26.542767 | 22 | 52.960594 | 26.548234 | 36 | 52.962296 | 26.535049 |
| 9 | 52.961679 | 26.543105 | 23 | 52.960746 | 26.547504 | 37 | 52.962764 | 26.536014 |
| 10 | 52.961788 | 26.542502 | 24 | 52.961989 | 26.547031 | 38 | 52.965441 | 26.533822 |
| 11 | 52.961419 | 26.542454 | 25 | 52.962391 | 26.547869 | 39 | 52.965482 | 26.534860 |
| 12 | 52.961700 | 26.541585 | 26 | 52.962611 | 26.547531 | | | |